якія стымулююць уласную вершатворчасць вучняў: "дапісванне" апошняга радка альбо страфы верша, напісанне вершаў па зададзенай схеме чаргавання радкоў (трыялет, актава, санет), напісанне вершаў па зададзеных рыфмах ці на прапанаваную тэму.

Драма (ад грэчаскага слова "дзеянне") – род літаратуры, які адлюстроўвае жыццёвыя з'явы праз паказ непасрэднага дзеяння. Асноўныя драматычныя жанры – трагікамедыя, фарс, вадэвіль, сатырычная і лірычная камедыя, гістарычная, сацыяльная, бытавая драма і г.д. Аднак любая п'еса пішацца перш за ўсё для сцэнічнага ўвасаблення, і з гэтага вынікаюць яе родавыя асаблівасці: вострая канфліктнасць дзеяння, дыялагічная форма, выбарачны паказ асобных, самых напружаных эпізодаў дзеяння, дзяленне на акты (дзеі) і сцэны, наяўнасць аўтарскіх рэмарак, насычанасць мовы твора падтэкстам. Ускладняе вучнёўскае ўспрыняцце драмы знешняя адсутнасць аўтарскай пазіцыі, таму асаблівую ўвагу пры чытанні п'есы трэба надаваць аўтарскім заўвагам (рэмаркам). Асноўная метадычная ўмова паўнавартаснага вывучэння драматычнага твора – стварэнне ва ўяўленні школьнікаў сцэнічнага эфекту. Для гэтага мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя метады і прыёмы: азнаямленне са сцэнічнай гісторыяй п'есы з выкарыстаннем альбомаў, афіш, тэатральных праграм, фотаздымкаў акцёраў у ролі; аналітычнае чытанне па ролях; складанне рэжысёрскага плана спектакля; стварэнне мізансцэн; распрацоўка эскізаў касцюмаў, грыма і дэкарацый да спектакля і інсцэніроўка асобных эпізодаў п'есы; наведванне тэатра, прагляд спектакля ці тэлеспектакля з наступным напісаннем водгука ці рэцэнзіі.

**Заключэнне.** Такім чынам, вывучэнне літаратурнага тэкста ў яго родавай і жанравай спецыфіцы і сродкамі, якія ёй адпавядаюць, дапамагае спасцігнуць эстэтычную прыроду твора, яго сэнс, змест і форму, зразумець розныя спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі, актывізуе цікавасць да вывучэння літаратуры, яе выхаваўчае і развіваючае ўздзеянне, стымулюе пазнавальную і творчую актыўнасць вучняў.

Спіс літаратуры

1. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю: Педагагічныя роздумы і пошукі / М.А. Лазарук. – Мінск: Народная асвета, 1994. – 200 с.

## СЕМАНТЫКА-ЭСТЭТЫЧНАЕ ПОЛЕ ПАЭЗІІ АНАТОЛЯ КАНАПЕЛЬКІ

*І.В. Саматой*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Сярод творчых індывідуальнасцей пасляваеннага, так званага філалагічнага пакалення, якое прыйшло ў літаратуру ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, сваёй адметнасцю і непаўторнасцю вылучаецца постаць віцебскага паэта, перакладчыка, літаратуразнаўцы, лаўрэата абласной літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча, педагога, які, на жаль, рана і нечакана пайшоў з жыцця, Анатоля Канапелькі. Паэзія А. Канапелькі – лірычная споведзь чалавека, які па-філасофску імкнецца асэнсаваць гістарычныя падзеі і з'явы з пазіцыі сучаснасці, праз гранічнае эмацыянальнае напружанне выявіць і сумясціць грамадзянскае і асабістае, высокае і будзённае.

Мэтай нашага артыкула з'яўляецца вызначэнне спецыфікі семантыка-эстэтычнага поля (ідэйна-тэматычных, жанрава-стылёвых асаблівасцей) паэзіі А. Канапелькі.

**Матэрыял і метады.** Аб'ектам даследавання сталі зборнікі А. Канапелькі "Зямная сімфонія" (1966), "Сустрэчы" (1979), "Музыка лістапада" (1999), "Жыццё прадоўжыцца ў песні" (2010). Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтнага і апісальнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Характар творчасці пісьменніка, як вядома, абумоўліваецца яго біяграфіяй. Нарадзіўся А. Канапелька 16 лістапада 1939 года ў мястэчку Расоны Віцебскай вобласці ў сям'і служачага. З першых дзён вайны бацькі знаходзіліся ў партызанскім атрадзе, які дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай вобласці. Пасля вайны вучыўся ў СШ №7 г. Полацка, а ў 1956 г. стаў студэнтам філалагічнага факультэта Полацкага педагагічнага інстытута, пазней факультэт перавялі ў Магілёўскі педагагічны інстытут. Пасля заканчэння вучобы ў 1961 г. працаваў дырэктарам школы, з 1968 г. выкладаў гісторыю беларускай літаратуры ў ВДУ імя П.М. Машэрава. Памёр 18 снежня 2002 года.

Вершы пачаў пісаць яшчэ школьнікам. У друку яны ўпершыню з'явіліся ў 1955 годзе ў полацкай газеце "Сцяг камунізму". Аўтар зборнікаў вершаў "Зямная сімфонія" (1966), "Сустрэчы" (1979), "Музыка лістапада" (1999), "Жыццё прадоўжыцца ў песні" (2010). Друкаваўся ў калектыўных зборніках "Дзвіна" (1958), "Калінові мост" (1969), "Беларускі каляндар" (1970), "Матчына слова"



Рэпазіторый ВДУ

(1991), “Анталогія беларускай паэзіі. Т.3” (1993). Вядомы як літаратуразнаўца, аўтар навукова-публіцыстычных артыкулаў, прысвечаных беларускім пісьменнікам. Перакладаў на беларускую мову вершы рускіх, польскіх, чэшскіх, венгерскіх, цыганскіх паэтаў.

У сваёй творчасці А. Канапелька захоўваў і працягваў класічныя традыцыі нашай нацыянальнай паэзіі, свядома арыентуючыся на лепшыя ўзоры паэзіі Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Караткевіча, пераклікаючыся з паэтамі-равеснікамі Р. Барадуліным, Г. Бураўкіным, М. Стральцовым, Д. Сімановічам. Ранняя паэзія А. Канапелькі ў асноўным мажорная па сваім настроі: адчуваецца бадзёрасць, захапленне навакольным светам, радасцю жыцця, усведамленнем сваёй значнасці ў свеце:

Мой свет адкрыты шчасцю
І дабрыні людской.
Нялёгка песню скласці
І стаць самім сабой [ с.45].

У літаратурным наробку паэта сваё пачэснае месца займае грамадзянская лірыка і вершаваная публіцыстыка, прадыктаваная логікай светаадчування лірычнага героя. Бязмежная любоў да Бацькаўшчыны, нацыянальнай спадчыны, паважлівыя адносіны да роднай мовы і культуры, бескампрамісныя адносіны да бездухоўнага і нізкага  вызначылі творча-грамадзянскую пазіцыю А. Канапелькі. Аўтар выказвае сваё разуменне падзей і з’яў, ацэньвае іх з пазіцыі паэта-патрыёта:

Я веру ў тое, што люблю,
Я веру ў тое, што кахаю,
У сваю пакутную зямлю,
З якой усе мы ўзрастаем.
Яна не здрадзіць, не прадасць,
Плыве ў сусвеце сціплай знічкай,
Калі патрэбна – сілы дасць,
А трэба – да сябе пакліча [1, с.6].

Гістарызм мыслення, асэнсаванне нацыянальных вытокаў характэрны для лепшых вершаў А. Канапелькі (“Беларусі”, “Я параўнаю з дзівасілам”, “Васілю Быкаву”, “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “На Івана Купалу”, “Зямная сімфонія”). Вяртанне да роднага слова, малітоўнае пакланенне беларускай мове, мацерыку духоўнай культуры, стала адной з важнейшых складаючых канцэпцыі паэзіі А. Канапелькі. Урачыста-песенная інтанацыя, узрушанасць і прачуласць яднаюць верш “Роднае слова” віцебскага паэта з вершам “Родная мова” П. Панчанкі:

Адкрываю, як свет, нанова
беларускае роднае слова,
пералівістае – як каменьчык,
вясёлкавае – як ручэй,
цёплае – як агеньчык
добрых тваіх вачэй,
светлае – як маланка,
гнеўнае – як пярун,
ціхае – як калыханка,
вечнае – як Беларусь![1, с. 9]

Тэма Вялікай Айчыннай вайны з ранняга маленства трывала ўвайшла ў псіхалагічны, эмацыянальны стан паэта. З першых дзён вайны бацькі паэта знаходзіліся ў партызанскім атрадзе “Радзіма” брыгады “Разгром”, які дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай вобласці. Маці, ідучы на заданне, брала з сабой малога Толіка, мазала яго зялёнкай, выдаючы за хворага, і бесперашкодна траплялала ў горад. Рэальна перажытае і адпакутаванае пазначана дыханнем трагізму:

не забыць ваенныя гады,
цяжар нечалавечы на плячах,
як чорным крумкачом кружыўся чорны дым
і сонца чорнае канала ў вачах [1, с.13].

Ваенная тэматыка асэнсоўваецца ў вершах, “Памяць”, “Мы нарадзіліся такімі”, “Франтавыя дарогі”, “Колькі блізкіх і родных імён”, “У Брэсцкай крэпасці”, дзе сказанае пра сябе стала прыналежным да пакалення дзяцей вайны, як іх асабістае і запаветнае. Творы паэта мелі і сваіх канкрэтных адрасатаў, многія з іх прысвечаны землякам-літаратарам П. Броўку,

Репозиторий ВГУ

У. Караткевічу, В. Быкаву, Е. Лось, Р. Барадуліну, сябрам, калегам З. Канапельцы, Д. Сімановічу, М. Цішачкіну, У. Папковічу.

Літаратуразнаўца В. Русілка, характарызуючы паэзію А. Канапелькі, адзначыла: "Невыпадкова ў гэтым светлым і лёгкім, як узмах крыла, імені – Анатоль Канапелька – прыцішана гучыць мелодыя мудрага і спакойнага анапеста, самага «інтэлігентнага» з вершаваных памераў, найбольш прыдатнага для філасофскай элегіі ці малітвы" [2, с. 4 ]. У лірыцы позняга часу, прасякнутай магістральнымі радкамі "Я кожны дзень сябе знаходжу…" шмат філасофскіх рэфлексій, медытатыўнай танальнасці. Элегічныя вершы-роздумы ("Яшчэ адна восень паляцела ў вырай", "Не трэба чалавеку адзіноты", "Не хавайце сваіх усмешак", "Лістапад", "Адыходзяць сябры адыходзяць") звернуты да вечных ісцін і каштоўнасцей, вялікай стваральнай сілы прыгажосці і дабра. Несумненна, значныя набыткі паэта і ў асэнсаванні тэмы кахання. Інтымная лірыка А. Канапелькі акрэслівае характэрную асаблівасць яго героя – вернасць пачуццю, павагу да жанчыны. Унікальная з'ява ў беларускай паэзіі – любоўныя вершы прысвечаны адзінаму каханню – жонцы Святлане. Вобразы прыроды гарманічна спалучаюцца з пачуццямі закаханых у вершах "Зорка Святлана", "Завея круціць, як прадонны вір", "Маёй любові снежны зарапад", "Любімая, не трэба сумаваць". Вобраз вечна летняга эдэмскага сада персаніфікуецца ў вобраз беларускага зімовага сада, над якім "…любові ціхі зарапад // плыве ў прасторы харастава зямнога" [с. 57]. Праз усю творчасць А. Канапелькі праходзіць лейтматыў вернасці рамантычным ідэалам гуманізму і прыгажосці.

**Заключэнне.** Такім чынам, адметнасцю семантыка-эстэтычнага поля пэзіі А. Канапелькі з'яўляецца выверанае, устойлівае захаванне і працяг класічных традыцый беларускай нацыянальнай паэзіі. Паэт таленавіта, па-мастацку аб'ядная ў сваёй лірыцы грамадзянска-публіцыстычныя і філасофска-медытатыўныя матывы, прадэманстраваў высокае майстэрства стварэння паэтычнага вобраза, сімвала, мастацкай дэталі, разнастайных прыёмаў і сродкаў. Зманлівая прастата традыцыйных памераў яго лірыкі хавае ў сабе глыбокі духоўны сэнс і сапрўдную эстэтычную культуру, выяўляе дакладную кардыяграму жыцця паэта, здольнага на глыбокае самавыяўленне.


Спіс літаратуры

1. Канапелька, А. Жыццё прадоўжыцца ў песні / А. Канапелька. – Віцебск: УА "ВДУ імя П. М. Машэрава". – 2010. – 73 с.
2. Русілка, В. Самыя добрыя песні / В. Русілка // Віцебскі рабочы. – 1994. – 30 лістапада. – С.7.


## ФУНКЦЫЯНАВАННЕ АГУЛЬНАСЛАВЯНСКІХ ПРОЗВІШЧНЫХ ТЫПАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА


*К.А. Сасноўская*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Структура сучаснага прозвішча ўяўляе сабой суадносіны прозвішчнай асновы і прозвішчнага фарманта. Фінальныя элементы сучаснага прозвішча мы будзем называць антрапафармантам (па азначэнню Н.У. Падольскай) [5]. Як слушна заўважае ў сваёй манаграфіі Г.М. Мезенка, фінальныя элементы, якія паўтараюцца (у тым ліку і суфіксы), валодаюць пэўным анамастычным значэннем: яны сведчаць, што гэта не ўласнае імя, не імя па бацьку, а прозвішча ці мянушка [2, с. 79].

Набор агульнаславянскіх прозвішчных фармантаў аднолькавы па ўсёй Беларусі. Актуальным уяўляецца выдзеліць рэгіянальную сістэму агульнаславянскіх прозвішчаў сярод астатніх.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцей функцыянавання агульнаславянскіх прозвішчных тыпаў на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна.

**Матэрыял і метады.** Матэрыял даследавання – прозвішчы жыхароў Бешанковіччыны (2700 адзінак). У ходзе аналізу фактычнага матэрыялу выкарыстоўваліся метады лінгвістычнага апісання, параўнальна-супастаўляльны, у тым ліку элементы арэальнага і статыстычнага.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Да агульнаславянскіх прозвішчных тыпаў належаць тып на **-оў/-еў/-аў**, **-ін/-ын**, тып на **-скі/-цкі**, тып на **-іч/-ыч/-ыц**, тып на **-ак/-як**, тып на **-ік/-ык/-чык**, тып на **-ец/-эц**, **-авец**.

Да прозвішчаў на **-оў/-еў/-аў** М.В. Бірыла далучыў тып на **-ін/-ын**, паколькі "яны маюць аднолькавую матывацыю – утвараюцца ад імені ці імені-мянушкі бацькі суфіксам *-оў/-еў/-аў* ад